Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г. ПЯТНІЦА
№ 202 (26315)
Кошт 500 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Прамая лінія

## РАБОТА ПЛЮС «ГАЛОЎНАЕ ПЫТАННЕ»

Кантракты, рэжым працы і адпачынку, водпускі, іншыя нюансы працоўнага заканадаўства, а таксама ўсё, што датычыцца «кватэрнага пытання» і нерухомасці — пастаноўка ў чаргу на паляпшэнне жыллёвых умоў, дарэнне, завяшчанне, атрыманне ў спадчыну маёмасці і яе падзел. Аб усім гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» **з загадчыкам юрыдычнай кансультацыі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Уладзімірам Іванавічам ШЭЛКОВІЧАМ і намеснікам загадчыка юркансультацыі ФПБ Васілём Мікалаевічам КОРСУКАМ.**

ТАКІМ ЧЫНАМ, УВАГА! Паводле папярэдняй дамоўленасці, наша «прамая лінія» пройдзе **4 лістапада з 11.00 да 12.30** па рэдакцыйных тэлефонах: **(8 017) 292 38 21 і 292 38 92**. Папярэднія пытанні прымаюцца па нумары **(8 017) 287 17 57.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

# «АД ТАГО, НАКОЛЬКІ АБАРОНЕНЫЯ НАШЫЯ ЛЮДЗІ, ЗАЛЕЖЫЦЬ ДАЛЕЙШАЕ ЎСТОЙЛІВАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ўзяў учора ўдзел у заключным сумесным пасяджэнні Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі трэцяга склікання. Як зазначыў кіраўнік краіны напачатку свайго выступлення, парламентарыі плённа папрацавалі і ўпісалі яркую старонку ў гісторыю беларускай дзяржавы.**



Фота БЕЛТА.

Паводле слоў Прэзідэнта, парламентарыям трэцяга склікання прыйшлося працаваць у адзін з самых адказных перыядаў сучаснай Беларусі: складаныя і неадназначныя працэсы адбываліся і ў свеце, і ў нацыянальным маштабе. «У міжнародных адносінах з усёй відавочнасцю агалілася тэндэнцыя дыктату з пазіцыі сілы. У розных кропках планеты правакаваліся жорсткія канфлікты, абвастралася супрацьстаянне асобных дзяржаў і, самае страшнае, — народаў. Ваенна-палітычны блок НАТА актывізаваўся так, як быццам планета на парозе вайны. Новыя пагрозы наблізіліся ўшчыльную да межаў Беларусі, і не ўлічваць гэты фактар у нашай палітыцы сёння ніяк нельга», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Акрамя таго, сёння ў свеце большасць дзяржаў ахапіў глыбокі эканамічны спад. У такой сітуацыі, адзначыў Прэзідэнт, для нашай краіны было архіскладанай задачай вытрымаць удары сусветнага рынку, захаваць высокія тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця і забяспечыць сваю энергетычную і харчовую бяспеку. Ён падкрэсліў, што сёння ў свеце не проста стала менш крытыкаў мадэлі эканамічнага развіцця Беларусі, але яны зніклі наогул. «Больш таго, — дадаў Аляксандр Лукашэнка, — за мяжой загаварылі аб мэтазгоднасці пераймання беларускага вопыту». Што сведчыць аб тым, што беларуская мадэль эканомікі была «ўзята ад жыцця», яна ўлічвае інтарэсы народа. «Я неаднаразова гаварыў вам, што дзяржава не можа і не павінна пайсці ні з адной са сфер жыцця грамадства, калі яна можа забяспечыць развіццё. Сёння, на фоне сусветнага эканамічнага крызісу, да гэтага прыйшлі нават амерыканцы», — падкрэсліў Прэзідэнт. «Вы памятаеце, як я, быццам прадчуваючы гэты крызіс, падпісаў дэкрэты аб энергетычнай бяспецы, дысцыпліне і парадку і дэбюракратызацыі краіны, — нагадаў ён. — Усё трэба рэалізоўваць, і рэалізоўваць неадкладна».

Узгадаў Прэзідэнт і пра тое, што і ўнутрыпалітычная абстаноўка ў рэспубліцы таксама складвалася няпроста: «дэструктыўныя сілы пры фінансавай і арганізацыйнай замежнай падтрымцы спрабавалі навязаць нашаму народу тупіковы шлях развіцця, расхістаць з такой цяжкасцю дасягнутую палітычную стабільнасць грамадства». Аднак рэспубліцы, у якой былі кансалідаваныя здаровыя сілы грамадства, удалося справіцца са згаданымі праблемамі і новымі глабальнымі выклікамі сучаснасці.

Вялікай заслугай Нацыянальнага сходу трэцяга склікання кіраўнік Беларусі назваў тое, што дэпутаты паслядоўна праводзілі ў жыццё курс, які быў адобраны народам краіны, і кіраваліся не асабістымі амбіцыямі альбо прыватнымі палітычнымі інтарэсамі, а патрэбамі сваіх выбаршчыкаў і дзяржавы. «У нашай краіне не ўвайшоў у моду сезонны роспуск Парламента, стварэнне барыкадаў каля трыбун, бясконцы працэс дзялёжкі партфеляў, — заўважыў Прэзідэнт. — Беларускія парламентарыі займаюцца паўсядзённай карпатлівай працай, якая накіраваная на карысны грамадству вынік». Сённяшні вышэйшы заканадаўчы орган Беларусі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, — гэта інстытут дзяржаўнай улады, які склаўся, які мае палітычны аўтарытэт не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі, з самастойным стылем дзейнасці».

Паводле слоў кіраўніка краіны, Савет Рэспублікі і Палата прадстаўнікоў працавалі на працягу ўсяго тэрміну з высокай эфектыўнасцю. Ён зазначыў, што ад складу да складу парламентарыяў узрастаюць прафесіяналізм і канструктыўнасць дэпутацкага корпуса. Пра што сведчыць і наступнае: калі ў перыяд дзейнасці Нацыянальнага сходу першага склікання Савет Рэспублікі адхіліў амаль сем працэнтаў законапраектаў, што былі прыняты Палатай прадстаўнікоў, то ў трэцім скліканні — крыху больш за два працэнты; калі раней Прэзідэнтам з пярэчаннямі вярталася да трыццаці працэнтаў унесеных на подпіс законаў, то ў апошнія гады — каля двух працэнтаў.

Закранаючы пытанне пра тое, што было зроблена Нацыянальным сходам трэцяга склікання, Аляксандр Лукашэнка адзначыў маштабнасць працы: прынята восем кодэксаў, больш за 460 законаў і разгледжана звыш 70 дэкрэтаў Прэзідэнта. Сярод іх ён назваў дакументы, якія можна лічыць прынцыпова новай старонкай у нацыянальнай прававой сістэме: Бюджэтны кодэкс, Кодэкс аб судовым ладзе і статусе суддзяў, Працэсуальна-выканаўчы кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях. Асабліва Прэзідэнт выдзеліў Закон «Аб зацвярджэнні Асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі», якім завершана фарміраванне пакета праграмных законаў. Пасля доўгіх дыскусій удалося пераадолець міжведамасныя рознагалоссі і прыняць Закон «Аб Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь». «Сёння мы можам казаць пра тое, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка, — што абсалютна ўсе элементы палітычнай сістэмы суверэннай Беларусі рэгламентаваныя ў вышэйшай прававой форме — законамі».

Прэзідэнт выказаў удзячнасць дэпутатам Палаты прадстаўнікоў і членам Савета Рэспублікі за тое, што яны падтрымалі пазіцыю кіраўніка дзяржавы аб неабходнасці бязлітаснай барацьбы з карупцыяй. Ён узгадаў, што парламентарыі не пабаяліся ўключыць у законы, у прыватнасці, закон «Аб барацьбе з карупцыяй», самыя жорсткія меры супрацьдзеяння ёй. І не пайшлі на павадку ў дэмагогаў аб нейкай рызыцы кіраўніка. «Прыстойны кіраўнік, ідучы на вытворчую рызыку, бярэ адказнасць, а не хабар», — падкрэсліў ён. Дарэчы, і жыццё паказала, справядлівасць таго, што галоўным прыярытэтам нашай палітыкі была зроблена яе антыкарупцыйная накіраванасць. Па гэтым шляху сёння пайшлі Расія, Украіна і іншыя краіны. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў карумпаванай эканоміцы няма ні эфектыўнага гаспадарання, ні сацыяльнай абароны.

Важнай падзеяй лічыць Аляксандр Лукашэнка і з'яўленне Закона «Аб рэгістры насельніцтва». Цывілізаваную форму збору даных аб грамадзянах Прэзідэнт назваў «адным акном» у маштабах цэлай дзяржавы, якое дае магчымасць чалавеку аператыўна атрымліваць неабходны яму дакумент, а не бегаць па кабінетах у прыніжальных пошуках шматлікіх даведак. Разам з тым, кіраўніка Беларусі абурае той факт, што ў рэальным жыцці здараецца, што людзі вымушаны па-ранейшаму выпрошваць неабходныя ім дакументы. «Рэгістрацыя прадпрыемстваў, атрыманне ліцэнзій і сертыфікатаў, праведзенне здзелак па часе і складанасці пераўтварыліся амаль у такі ж працэс, як цяжарнасць і нараджэнне дзіцяці», — сказаў Прэзідэнт. І праінфармаваў прысутных, што для таго, каб усе гэтыя праблемы ўстараніць у гэтым годзе, ён даў адпаведнае даручэнне Прэм'ер-міністру, Кіраўніку Адміністрацыі Прэзідэнта, Старшыні праўлення Нацбанка, губернатарам і мэру Мінска. «Гэта іх экзамен на адпаведнасць пасадам, якія яны займаюць», — зазначыў Аляксандр Лукашэнка.

*(Заканчэнне на 2-й стар.)*

РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### 1020-годдзе ХРЫШЧЭННЯ РУСІ




25 кастрычніка 2008 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь уводзіць у паштовае абарачэнне блок з 3 марак «1020-годдзе хрышчэння Русі», падрыхтаваны ВЦ «Марка» РУП «Белпошта». Мастацкае афармленне Аляксандра Блінцова.

НУ І НУ!

### НІ ТУШОНКІ, НІ ГРОШАЙ

**Рэалізаваўшы салідным, як здавалася, пакупніку 28 тысяч 395 бляшанак ялавічнай тушонкі агульным коштам больш за 85 мільёнаў рублёў, у СВК «Гярвяты» Астравецкага раёна разлічвалі скараціць сваю запазычанасць перад дзяржавай і іншымі суб'ектамі гаспадарання. А ў выніку аказаліся і без прадукцыі, і без грошай.**

Вялікае жаданне набыць буйную партыю тушонкі і тым самым палепшыць фінансавае становішча гаспадаркі выказаў у ліпені мінулага года 28-гадовы мінчанін Генадзь Бельскі. У сельгаскааператыве яго ведалі як дзелавога партнёра па пастаўцы кармавых дабавак. Аднак на той момант ён ужо не з'яўляўся агентам гэтай кампаніі і тым не менш менавіта пад яе «шыльдай» дамовіўся з кіраўніцтвам гаспадаркі аб набыцці тушонкі. Адпаведныя дакументы былі «ліпавыя», а некаторыя наогул адсутнічалі, што не перашкодзіла Бельскаму атрымаць тавар без папярэдняй аплаты. А далей...

Да справы тут жа падключыўся яшчэ адзін пакупнік, які заплаціў за партыю мясных кансерваў ужо 88 мільёнаў рублёў наяўнымі. Але грошы за гэту тушонку на разліковым рахунку СВК так і не з'явіліся, паколькі іх «дабрадзей» вырашыў правярнуць яшчэ адну аперацыю. Праз інтэрнэт ён выйшаў на расійскую фірму, якая спецыялізуецца на пастаўках дабавак для камбікармоў і перадаў яе прадстаўнікам атрыманыя за тушонку мільёны. Разлік быў на тое, каб прадаць кармавыя дабаўкі і яшчэ больш павялічыць уласны «навар». Аднак прадукцыі ад расіян Бельскі не дачакаўся: фірма аказалася фіктыўнай, як кажуць у падобных выпадках, аднадзёнкай. Па сутнасці, яго «кінулі» гэтак жа, як і ён сам СВК «Гярвяты». Суд кваліфікаваў дзеянні Генадзя Бельскага як махлярства ў асабліва буйным памеры і вырашыў, што асэнсоўваць іх трэба тры з паловай гады ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. А галоўны бухгалтар сельгаскааператыва за перавышэнне службовых паўнамоцтваў з цяжкімі наступствамі асуджана да трох гадоў пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### АБЧЫШЧАНЫ «АБМЕННІК»

**У самым цэнтры Калінкавічаў, каля рынка, злачынца абакраў пункт абмену валюты ААТ Белаграпрамбанка. Здабытак невядомага склаў амаль 13 млн беларускіх рублёў, 500 украінскіх грыўняў, больш за 11 тысяч расійскіх рублёў, 320 еўра, 595 долараў ЗША.**

Здарэнне адбылося падчас абедзеннага перапынку. Як паведаміў начальнік Калінкавіцкага РАУС Васіль Кузьменка, супрацоўніца «абменніка» пакінула памяшканне без сігналізацыі, чым і скарыстаўся злачынца. Следчыя мяркуюць, што ён мог трапіць у памяшканне, падабраўшы ключы. Службова-разыскны сабака ў людным месцы не змог узяць след. На гэты момант узбуджана крымінальная справа, вядзецца следства.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

1020 ГОДДЗЕ ХРЫШЧЭННЯ РУСІ 2008

## Адна вера, адно хрышчэнне

**З нагоды ўрачыстасцяў, прысвечаных 1020-годдзю Хрышчэння Русі і 30-гадоваму служэнню Мітрапаліта Філарэта на зямлі Белай Русі ўчора ў Мінск прыбыў Свяцейшы Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Аляксій ІІ. У Нацыянальным аэрапорце Прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай Царквы сустрэлі царкоўныя іерархі, а таксама прадстаўнікі ўлады на чале з намеснікам прэм'ер-міністра Аляксандрам Косінцам.**

Патрыярх Аляксій вітаў беларускую зямлю словамі:

— Сёлета мы адзначаем 1020-годдзе з часу Хрышчэння Русі. Мы пачалі са святаў у Маскве на Архірэйскім саборы, потым урачыстасці былі перанесеныя ў Кіеў, і вось зараз яны адбываюцца ў Мінску. Гэта тры славянскія братнія народы, якія пачалі сваё гістарычнае і рэлігійнае быццё дзякуючы подзвігу роўнаапостальнага князя Уладзіміра — асветніка зямлі рускай. Не выпадкова трыадзінае святкаванне адбываецца ў Маскве, Кіеве і Мінску... Я рады прыбыць у Беларусь, у якой заўсёды з любоўю народ сустракае Нас, што сведчыць пра братнія пачуцці да рускага народа. Мы ў гэтыя дні таксама можам павітаць Уладыку Мітрапаліта Філарэта з яго 30-гадовым служэннем, якое можна адзначыць як подзвіг асабісты, дзяржаўны і царкоўны... Я думаю, што паміж нашымі народамі асаблівыя адносіны. Мы ўваходзім у Саюзную дзяржаву. Я рады, што адбудзецца сустрэча з Прэзідэнтам Беларусі. Мы з ім часта сустракаліся і заўсёды знаходзілі ўзаемаразуменне... У адзінстве нашы народы пераадолеюць усе цяжкасці, з якімі сутыкнуліся многія краіны, у тым ліку і нашы, у сувязі з сусветным крызісам.

Першым пунктам візіту Патрыярха стала наведванне Нацыянальнай бібліятэкі, дзе праходзіла пасяджэнне Міжнароднага Круглага стала на тэму «Хрышчэнне Русі ў лёсах народаў Расіі, Украіны і Беларусі». Завяршыўся першы дзень візіту Прадстаяцеля Рускай Праваслаўнай царквы наведваннем Дома Міласэрнасці. Сёння, а 9 гадзіне раніцы ў Мінскім Свята-Духавым кафедральным саборы адбудзецца галоўная падзея свяцейшага візіту — Божая літургія, якую ўзначаліць Патрыярх.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**




Мікалай ЯРАХОВІЧ — дырэктар доследнага рыбгаса «Белае» Жыткавіцкага раёна з сынамі Уладзіславам і Аляксандрам і жонкай Наталляй.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Да ведама дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь

Першая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання пачне сваю работу 27 кастрычніка 2008 года ў 10 гадзін у зале пасяджэнняў Палаты прадстаўнікоў (Дом Урада, Авальная зала). Рэгістрацыя дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў будзе праводзіцца 27 кастрычніка 2008 года з 8.00 да 9.50 у фае залы пасяджэнняў.

## Новы парадак увозу аўтамабіляў

Парадак часовага ўвозу аўтамабіляў грамадзянамі Беларусі ў Расію ўступіў у сілу з сённяшняга дня, паведаміў журналістам старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Аляксандр Шпілеўскі.

Паводле яго слоў, Міністэрства юстыцыі Расіі зарэгістравала загад дырэктара Федэральнай мытнай службы РФ, у адпаведнасці з якім грамадзяне Беларусі пры ўвозе аўтамабіляў у Расію будуць афармляць часовы ўвоз тэрмінам на шэсць месяцаў.

**Аляксей БУКЧЫН, БЕЛТА.**

ISSN 1990 - 763X

Мінскі гарадскі цэнтр нерухомасці

Минский городской центр недвижимости

**ПРИГЛАШАЕТ К УЧАСТИЮ В АУКЦИОНАХ**

**по продаже объектов недвижимости:**

- административного и вспомогательного (котельная) зданий ОАО «Белаттракцион» на ул. Могилевской, 68 (304,8 кв.м и 69 кв.м, земельный участок – 0,1733 га);
- комплекса зданий и сооружений ОАО «Минскконтракт» на ул. Смоленской, 51 (земельный участок – 1,2031 га);
- здания ОАО «Горизонт» на ул. Красной, 7 (7 157,7 кв. м);
- производственного помещения на ул. Лукьяновича, 10 (194,1 кв. м).

**Телефоны для справок: (017)227 48 36, (017)227 40 22 (сайт: www.mgcn.by).**

УНП 190398583

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.10.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 115,00 | 1 польскі злоты | 712,71 |
| 1 еўра | 2 712,06 | 1 расійскі рубель | 78,39 |
| 1 латвійскі лат | 3 823,21 | 1 украінская грыўня | 367,83 |
| 1 літоўскі літ | 785,46 | 1 балгарскі леў | 1 386,25 |
| 1 чэшская крона | 104,66 | 1 новая турэцкая ліра | 1 261,03 |

**БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (ПРОДАВЕЦ) СОВМЕСТНО С КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Логойском районе:**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка, га | Наличие инженерных сетей | Начальная цена (бел. руб.) | Задаток (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Мочаны, 623280406101000265 | 0,1331 | Сети электроснабжения, газоснабжения | 3 181 200 | 310 000 |
| 2 | д. Мочаны, № 3, 623280406101000261 | 0,1973 | | 4 715 630 | 470 000 |
| 3 | д. Марковщина, № 1, 623280404601000270 | 0,1107 | | 2 079 640 | 200 000 |
| 4 | д. Марковщина, № 2, 623280404601000271 | 0,1121 | | 2 105 940 | 210 000 |
| 5 | д. Дубница, № 1, 623280402601000024 | 0,1312 | Сети электроснабжения, в непосредственной близости сети водоснабжения | 728 640 | 70 000 |
| 6 | д. Дубница, № 2, 623280402601000025 | 0,1403 | | 779 210 | 70 000 |
| 7 | д. Дубница, № 3, 623280402601000026 | 0,2387 | | 1 325 720 | 130 000 |
| 8 | д. Семково, № 1, 623280407601000067 | 0,2187 | | 2 474 740 | 240 000 |
| 9 | д. Семково, № 2, 623280407601000066 | 0,2500 | | 2 828 930 | 280 000 |

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона в сумме – 1 206 600 рублей (по каждому лоту). Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **01.12.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **28.11.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8 017) 224 61 34. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.**

*КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.*

БЕЛАРУСБАНК

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,**

*расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32,*

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 29 ОКТЯБРЯ 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:**

***1. О досрочном прекращении полномочий членов Наблюдательного совета ОАО «АСБ Беларусбанк».***
***2. Об избрании членов Наблюдательного совета ОАО «АСБ Беларусбанк».***
***3. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.***

*Собрание состоится по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, ОАО «АСБ Беларусбанк».*

*Регистрация участников собрания с 9.00 до 9.45.*

*Начало проведения собрания в 10.00.*

Акционеры могут участвовать в собрании лично или через своих представителей, чьи полномочия должны быть соответствующим образом заверены.

**Для регистрации акционерам необходимо при себе иметь:**

- юридическим лицам – руководителям – служебное удостоверение; представителю – доверенность на представление юридического лица на собрании акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» и паспорт;
- физическим лицам – паспорт; представителям – доверенность, удостоверенную в установленном порядке, и паспорт.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в годовом Общем собрании акционеров ОАО «АСБ Беларусбанк» – 24 октября 2008 года.

Информация по вопросам повестки дня представляется акционерам ОАО «АСБ Беларусбанк»:

- начиная с 24 по 28 октября 2008 года – по месту нахождения банка: г. Минск, ул. Мясникова, 32 с 8.30 до 17.30;
- 29 октября 2008 года – по месту проведения собрания.

**Телефоны для справок: (8 017) 218 84 38, 218 87 72.**

УНП 100325912

БПС-БАНК

**ОАО «БПС-Банк» устанавливает с 24 октября 2008 г. следующие условия по вновь выпускаемым сберегательным сертификатам физических лиц в белорусских рублях:**

| Срок обращения | Размер процентов (годовых) | Номинальная стоимость (белорусских рублей) | Периодичность выплаты процентов |
|---|---|---|---|
| 6 месяцев | 15,5 | от 500 000 | Одновременно с погашением сберегательного сертификата |

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении ОАО «БПС-Банк», на веб-сайте (www.bpsb.by) или по телефону – 148 (многоканальный).**

**Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности.*

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйны № 12.

24 КАСТРЫЧНІКА 2008 г. ПЯТНІЦА № 42 (15546)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Нітка да ніткі. З дзённіка звычайнага студэнта

# КАБ НА ПАРУ НЕ СПАЗНІЦЦА, ТРЭБА...

Звычайна, калі заспаны студэнт вінавата стукаецца ў дзверы якой-небудзь аўдыторыі гадзіне а дзевятай зранку, ведайце — спазніўся бедны чалавек. Чаму? Слушнае пытанне, але адказаць на яго адразу цяжка.

Прычыны спазненняў сярэднестатыстычных студэнтаў часам залежаць ад тэмпераменту, прафесійнай дзейнасці (калі такая маецца), жадання паспаць, асабістай сімпатыі да выкладчыка ці прадмета і часам нават ад полу (аднаго парэзала лязо брытвы падчас галення, у другой — абцас адляцеў, і прыйшлося вяртацца дадому, каб пераабуцца).

Праблемы ўзнікаюць праз тое, што выкладчыкам часам усё адно: праспаў ты альбо проста сеў не на той аўтобус, закахаўся альбо наадварот, цяжка перажываеш расстанне. Спазненне ёсць спазненне: ты не пунктуальны, паказваеш сваю непавагу і ўвогуле, хто ты такі, каб спазняцца!?

Але паверце, шаноўныя выкладчыкі, у тых, хто спазняецца, такіх думак у галаве нават і не ўзнікае. Студэнты па прыродзе сваёй такія, не зусім сабраныя проста. Вось я, да прыкладу. Здаецца ніколі і не жыў я на той Басейнай вуліцы, а ўражанне — быццам у мяне палова кварталу там ва ўласнасці...



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### Да пачатку пары дзесяць гадзін

Здаровы сон — гарантыя здароўя фізічнага і псіхічнага. Кожны вечар робіш гэтае сцвярджэнне дэвізам дня і бярэш з сябе абяцанне, што сёння абавязкова спаць пойдзеш раней. Адразу на памяць прыходзіць чутая некалі і ад некага формула здаровага начнога сну: сем гадзін у суткі. У думках, ужо загінаючы пальцы, лічыш, колькі гэта і вылічваеш, колькі ж гадзін недасыпу атрымліваецца!..

Калі ўставаць на заняткі трэба толькі заўтра, то сёння паводзіш сябе спакойна і ўпэўнена — як слон. І забываешся сачыць за часам. А ён не проста ідзе (гэта вам не лекцыя) — ён бяжыць, імчыцца хуткасным цягніком Бабруйск—Асіповічы, ляціць самалётам «Мінск — Барысаў» і падбягае яшчэ бегам марафонца.

### Да пачатку пары дзве гадзіны

Не паверыце, але выязджаючы з дому нават за дзве гадзіны, усё роўна можна спазніцца. Пробкі.

Тут і атрымоўваецца, што як не старайся — полем, лесам, пералескам, на аленях, на каленях — а ўсё адно не паспееш. У такія хвіліны хочацца часам бы ў тым фантастычным фільме, спыніць час і спакойна дайсці да патрэбнага месца. А пасля час уключыць. Толькі не вельмі хацелася б, каб такі прыбор быў у кожнага студэнта...

### Да пачатку пары 40 хвілін

І чаму гэта, як ты кудысьці спяшаешся, то аўтобус абавязкова прыедзе са спазненнем, набіты бітком, з кандуктарам і ў прыдатак будзе спыняцца ля кожнага святлафора. Стаіш так часам у аўтобусе, прыплюснуты тварам да дзвярэй з носам а-ля пятак парсючка і разважаеш пра сябе над «пытаннямі быцця»... Гэта ўчарашнім адгалоскам дае аб сабе знаць лекцыя па філасофіі. А вось узгадваецца і тое, што патрабавала ведаць выкладчыца на тэсце па эканамічнай дысцыпліне: «Кожны пяты ці кожны чацвёрты беларус адсвяткаваў наваселле ў 1985 годзе?» І навошта нам гэта?

Аўтобус чарговы раз спыніўся. Усе напружана маўчаць і нярвуюцца. Эх, узяць бы зараз і праз верхні люк выскачыць, а пасля, як Джэймс Бонд, на асфальт саскочыць. А затым бягом...У любым выпадку гэта было б хутчэй, чым стоячы тут, прыціснутаму да шыбы, маляваць на ёй носам ружу вятроў.

Побач — дзве дзяўчыны, адна — з доўгімі валасамі. Дыялог:

— Як расчасацца? Натоўпу — процьма.

— Давай я памагу.

— Ага, каб у мяне вочы на лоб палезлі? Я памятаю, як ты майго Мурзіка папрычэсвала. Бедны, ён і сёння пад ложак ад цябе хаваецца.

Чамусьці ў такія хвіліны ты ўжо і не шкадуеш, што дачакаўся гэтага аўтобуса. Аказваецца, калі скласці два мінусы, атрымаецца плюс.

### Да пачатку пары 15 хвілін

Але калі плюс раскласці, то будуць зноў два мінусы: занятак пачынаецца праз пятнаццаць хвілін, а ехаць — столькі ж.

Паратунак — метро. Але чамусьці калі «шанцуе», дык ва ўсім: забыўшыся дома праязны, становішся ў кіламетровую чаргу за адным жэтонам...

Нарэшце, дачакаўшыся вагона, упіхваешся ў яго і толькі калі дзверы зачыніліся, чуеш: «Наступная станцыя — Першамайская: выхад на правы бок...» І навошта трэба было штурхацца ў гэты вагон, калі ехаць патрэбна ўсё роўна ў іншы бок, да «Фрунзенскай». Вось жа менталітэт: сунуўся ў самы цесны вагон толькі таму, што туды сунуліся астатнія...

### Да пачатку пары пяць хвілін

Насамрэч, за пяць хвілін многае можна паспець. Праўда, як і НЕ паспець. Выйшаўшы з метро, заўважаеш паўпусты тралейбус, які нібыта збіраецца ехаць у бок вучэбнага корпуса. А што ісці — я і пад'еду. Дарагія чытачы, ніколі не сядайце ў тралейбусы, трамваі, аўтобусы невядомага маршруту — горкім вопытам праверана: небяспечна для жыцця нервовых клетак галаўнога мозга!

### Да пачатку пары дзве хвіліны

«Вось вылезу я з гэтага тралейбуса і даю зарок, бліжэйшы месяц, прынамсі, больш у яго не сяду. Ці ж гэта жарты: да канечнай прыйшлося ехаць!?».

Не бяда, што ў запасе толькі дзве хвіліны, як там у спрынце кажуць: гэты спартсмен і не з такіх хвілін выбягаў? Не пытанне, з нашым транспартам, кожны даўно сам сабе спартсмен. Шкада толькі, што нават паказаўшы рэкорд Юліі Несцярэнкі наўрад ці да пачатку пары паспееш. Паспееш-непаспееш, а бяжыш.

Кім ты сябе ў гэты час толькі не ўяўляеш: і закаханым, што імчыцца да дзяўчыны з кветкай, і попзоркай, якая ўцякае ад фанатаў, і дзедам Іванам, які кожную раніцу паўз вокны твайго дома робіць ранішнюю прабежку, і нават самой Юліяй Несцярэнкай, якая збіраецца завяваць яшчэ адно алімпійскае золата...

Бегучы праз прыступкі пераходаў, затым па прыступках універсітэта, а пасля па лесвіцы на патрэбны паверх месца сабе не знаходзіш: што ж прыдумаць у апраўданне, ці можа ўжо і нявартa нічога; ці прыкрыла мяне стараста, а можа яе самой няма; ці правяраў ужо дэканат і ўвогуле, мы хоць на тым паверсе, куды я бягу, ці на паверх вышэй? І чаму гэта я сёння нешта аніводнага аднакурсніка па дарозе не сустрэў?..

Вось і аўдыторыя. Як там сказана: стукайцеся і вам адчыняць?

* * *

Ух ты... А ў аўдыторыі — нікагусенькі. Вось, браткі: зноў дзень пераблытаў — мы ж сёння ў другую змену! Эх, Ілья Браніслававіч...

**Ілья ЛАПАТО.**

# ЭСТАФЕТА ПАКАЛЕННЯЎ

**Аўтапрабег «Эстафета пакаленняў», прысвечаны 90-годдзю камсамола пад дэвізам: «Нам, маладым, будаваць моцную і квітнеючую Беларусь!» праводзяць гэтымі днямі, напярэдадні памятнай даты, Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту і Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі.**

Удзельнікамі аўтапрабегу сталі актывісты маладзёжнага саюза, ветэраны камсамола, прадстаўнікі



Першы сакратар ЦК БРСМ Юрый КРЫВАДУБСКІ ўручае білет члена БРСМ Вікторыі БАЛАКЛІ.

розных грамадскіх аб'яднанняў, моладзь Мінска і Жодзіна, працаўнікі ДТСААФ, дзіцячых і юнацкіх школ па стралковых і па водных відах спорту ДТСААФ, Цэнтральны аэраклуб імя двойчы Героя Савецкага Саюза Сяргея Грыцаўца.

Старт аўтапрабегу быў дадзены ў музеі гісторыі ДТСААФ, пасля чаго ўдзельнікі наведалі спецыялізаваную дзіцяча-юнацкую спартыўна-тэхнічную школу, дзе адбыліся спаборніцтвы сярод актыву БРСМ па кулявой стральбе. Каля архітэктурна-скульптурнага комплексу «Мінск—горад-герой» адбыўся мітынг, на якім удзельнікаў аўтапрабегу павіталі і павіншавалі з маючай адбыцца грандыёзнай падзеяй у маладзёжным руху краіны Першы сакратар ЦК БРСМ Юрый Крывадубскі , старшыня Цэнтральнага савета ДТСААФ генерал-маёр Анатоль Якаўлевіч, Іван Ільіч Кустоў, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза.

Удзельнікі аўтапрабегу ўсклалі да мемарыялу вянкі, кветкавыя кампазіцыі і ўшанавалі памяць воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, хвілінай маўчання.

Сімвалічна, што ў гэтым знакавым месцы ў рады Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі прынялі самых актыўных прадстаўнікоў маладога пакалення сталіцы.

Разнастаіла правядзенне аўтапрабегу серыя маладзёжных флэш-акцый, якія сталічная моладзь арганізавала на пляцоўцы каля стэлы ў рамках праекту БРСМ **«КАМСАМОЛУ — 90! НОВЫ ФАРМАТ!»**, прысвечанага яркай даце ў біяграфіі маладзёжнага руху краіны — 90-гадоваму юбілею камсамола.

Актывісты прапаноўвалі мінчанам адправіцца **«У будучыню — разам!»**, запусціўшы праз сімвалічнае «кольца часу» ў паштовую скрыню выраблены з паперы самалёцікі з напісанымі на іх пасланнямі для моладзі будучыні. Дарэчы, самыя цікавыя лісты стануць экспанатамі музея камсамольскага руху Ленінскага раёна Мінска.

Таксама можна было арыгінальна павіншаваць моладзь сталіцы з днём нараджэння камсамола, надзьмуўшы паветраны шарык і напісаўшы на ім сваё імя і пажаданне, **«Удыхнуць у камсамол новае жыццё»**...

На памяць аб удзеле ў моладзевым праекце ў гараджан, акрамя выдатнага настрою, засталіся святочныя буклеты і фатаграфіі з касцюмаванымі персанажамі.

На гэтым маладзёжны вояж не скончыўся: працягам насычанай праграмы аўтапрабегу стане наведванне Цэнтральнага аэраклуба імя двойчы Героя Савецкага С. Грыцаўца, пасля чаго ўдзельнікі адправяцца ў г. Жодзіна, дзе каля манумента ў гонар Маці-патрыёткі А.Ф. Купрыянавай адбудзецца мітынг і ўскладанне кветкавых гірлянд.

**Аляксандра ЛЕБЕДЗЕВА.**
**Фота Віктара ТАЛОЧКІ, БЕЛТА.**

# САЛАМОН. Прыемна пазнаёміцца!

**Самір, Саламон і Якаў. Вы падумалі, што гэта імёны герояў з наступнай «мыльнай» оперы. А вось і не! Так завуць траіх суседскіх дзяцей. Такія імёны ім даў бацька, маці была не супраць. А дзеці?**

Сёння выбіраць для немаўлят рэдкія імёны стала модна. У пошуках патрэбных імёнаў бацькі скупляюць у кнігарнях энцыклапедыі, прагортваюць слоўнікі, вывучаюць царкоўныя календары. Замест звыклых мужчынскіх Дзіма, Гена, Ваня, Коля ўсё часцей можна пачуць Данііл, Герман, Мікіта, Кім, Лаўрэнцій. Дзяўчатак хутчэй назавуць Рэнатай, Віленай, Віялетай, Маяй, Каралінай, Карынай, чым Машай, Аняй, Наташай і Кацяй. І гэта зразумела. Бацькі хочуць, каб іх дзіця было лепшым за ўсіх, чым-небудзь вызначалася паміж іншых, для пачатку хоць бы імем.

І вось самае нязвыклае, рэдкае, цяжкае імя выбрана. Адна хвіліна — і яно аказваецца ў пасведчанні аб нараджэнні немаўляці. Бацькі задаволены выбарам. А ці задаволены выбарам бацькоў дзеці?

Яраслава носіць з гонарам сваё імя ўжо сямнаццаты год. Так захацела назваць сваю дачку маці дзяўчыны.

***— Ці ўтульна табе з тваім імем?***

— Я ўдзячная сваім бацькам, што мяне так назвалі. Яраслава — вельмі прыгожае імя, у некаторай ступені звязана з гісторыяй нашага народа. Пры знаёмстве маё імя адразу запамінаецца. Толькі вось настаўнікі, якія прыходзяць у клас на замену, першай заўсёды выклікаюць мяне, хоць у спісе стаю перадапошняй.

***— Як у будучым ты назвала б сваіх дзяцей?***

— Назаву іх яшчэ больш рэдкімі імёнамі. Напрыклад, дзяўчынку — Маланняй, а хлопчыка — Мацвеем.

Марадона прыехаў у Беларусь два гады таму з Тальяці, калі яму было трынаццаць. Нарадзіўся ж хлопчык у Арменіі. Для Беларусі, як і для Расіі і Арменіі, імя Марадона — вельмі рэдкае. Магчыма, у гэтых краінах яно адзінае.

***— Чаму цябе назвалі менавіта так?***

— Як і многія іншыя, мой бацька любіць футбол. Любімым яго футбалістам быў сусветна вядомы Дыега Марадона. Па яго «міласці» мяне так і назвалі.

***— Як твае новыя знаёмыя рэагуюць на такое незвычайнае імя?***

— Часцей за ўсё яны ўпэўнены, што Марадона — гэта мянушка, а я вельмі добра гуляю ў футбол *(смяецца)*.

Маленькай Ульяне няма яшчэ і годзіка, і тое, што яе назвалі незвычайным імем, ёй пакуль няважна. З пытаннямі звярнулася да яе старэйшай сястры Дашы.

***— Табе не шкада, што бацькі назвалі цябе не такім рэдкім імем, як тваю сястру?***

— Не, імя сястрычцы мы выбіралі разам. Мама часта чытала нам казку, дзе прынцэсу з казачнай краіны звалі Ульянай. Казка нам вельмі падабалася, а імя прынцэсы асабліва. Вось і вырашылі назваць сястрычку Ульянай.

***— Калі б табе давялося выбіраць сабе новае імя, якім бы яно было?***

— Аня.

У Дашы і Ульяны ёсць два малодшыя браты. Пётр і Павел — блізняты. Нарадзіліся яны ў дзень святкавання хрысціянскага свята Пятра і Паўла. З выбарам імён бацькам не было праблем.

Шаснаццацігадовага Марэка прасцей за ўсё знайсці ў эма-тусоўках. У жыцці яму падабаецца ўсё, акрамя асабістага імя.

***— Марэк — вельмі прыгожае імя з польскімі каранямі. Чым табе яно не падабаецца?***

— Я карэнны беларус. Навошта мне такое імя? Хачу, каб мяне называлі так, як і маіх сяброў: Саша, Паша, Дзіма...

***— Што скажаш пра імя Марадона?***

— Дыега Марадона — добры футбаліст. Але свайго сына я такім імем не назваў бы.

Часта дзяўчатак называюць імёнамі, вытворнымі ад назваў месяцаў. Напрыклад, хто нарадзіўся ў марце — Марта. Мая нарадзілася дваццаць гадоў таму ў маі.

***— Як табе тваё імя?***

— З тым, што мяне называюць незвычайна, я даўно звыклася. Цяпер «Мая» гучыць для мяне гэтак жа звыкла, як і Оля, Света. Перавага майго імя — ніхто не забываецца, у якім месяцы ў мяне дзень нараджэння.

Як будуць называць дзяцей у будучым? Якія імёны будуць моднымі праз 100 гадоў? Ніхто не ведае. Вядома толькі адно: не імя ўпрыгожвае чалавека, а чалавек — імя.

**Жанна БАЙГОТ,**
**студэнтка ГрДУ імя Я. Купалы.**

Сяргей КРЫВЕЦ:

# «УДАЛАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ БАТЭ — ГЭТА ВЫНІК РОСТУ БЕЛАРУСКАГА ЧЭМПІЯНАТУ»

**Гэтай восенню не вельмі збалаваныя беларускія аматары футболу дачакаліся сапраўднага свята. Маладзёжная зборная Беларусі другі раз у гісторыі дабілася права ўдзельнічаць у фінальным турніры чэмпіянату Еўропы. А барысаўскі БАТЭ ўпершыню выступае на групавым этапе Лігі Чэмпіёнаў. І як выступае! Карэспандэнт «ЧЗ» сустрэўся з чалавекам, які стаў удзельнікам абедзвюх знамянальных падзей. Знаёмцеся: паўабаронца БАТЭ і маладзёжнай зборнай Сяргей КРЫВЕЦ.**

— Калі пасля гульні мы зайшлі ў раздзявальню, была цішыня. Многія, канешне, стаміліся. Аднак радасці, што згулялі з «Зенітам» унічыю, не было. Маглі лепш згуляць, перамагчы. Вось пасля «Ювентуса» была сапраўдная радасць. Там мы ўзялі першае ачко ў Лізе Чэмпіёнаў, а апетыт прыходзіць — ведаеце калі... Хацелася б большага. Мы павінны былі перамагаць і «Зеніт», і «Ювентус»... Спадзяюся, у нас усё яшчэ наперадзе, у тым ліку — і першая перамога ў турніры. Яна не за гарамі!

***— Вы самі, напэўна, адчуваеце, што балельшчыкі чакаюць ад вас большага, чым проста дастойнай гульні ў Еўропе?***

— Безумоўна, адчуваецца ўвага з боку балельшчыкаў. Уразіў ажыятаж на матчы з «Юве». Пасля гульні людзі падыходзяць, дзякуюць за выступленне. Прыемна. Аднак мы разумеем, што ў выпадку паражэнняў і адносіны да нас будуць іншымі.

***— Вы ўжо згулялі з усімі сапернікамі па групе. Хто ўразіў больш за астатніх?***

— Мадрыдскі «Рэал». І па гульні, і па ўзроўні майстэрства футбалістаў. Гэта быў наш дэбют у Лізе Чэмпіёнаў, мабыць таму запомнілася ўсё — і стадыён, і балельшчыкі, і ўвогуле арганізацыя матча. Паядынак супраць «Ювентуса» — першы «хатні» і першае ачко ў турніры. У рэшце рэшт, кожны матч Лігі Чэмпіёнаў — гэта нешта своеасаблівае. Такое, што цяжка перадаць словамі.

***— Каго б ты вылучыў персанальна?***

— У «Рэале» спадабалася гульня Ван дэр Ваарта, Гуці, Рабэна. У «Ювентусе» ўразілі Дэль П'ера і Недвед. У «Зеніце» вылучаюцца на фоне іншых Аршавін і Данні. Гэта майстры, якія ўваходзяць у лік найлепшых футбалістаў планеты, і сваёй гульнёй толькі пацвярджаюць гэты статус.

***— Поспех беларускай «маладзёжкі» — высокі ўзровень каманды ці проста фарт?***

— Мне здаецца, наша маладзёжная зборная была дастойная гэтага месца ў фінальным турніры Еўра. Туркам першы матч мы прайгралі 0:1, аднак гэта быў не самы дрэнны вынік для выязнога паядынку. А ўжо дома мы даволі ўпэўнена кантралявалі сітуацыю і толькі пасля таго, як лік стаў 2:0 на нашу карысць, крыху збавілі хуткасць.

***— Значыць, пасля паражэння ў Турцыі былі ўпэўнены ў канчатковым станоўчым выніку?***

— Канешне. Адзін гол даволі лёгка адыгрываецца. Таму мы з нецярпеннем чакалі ігры ў адказ і верылі, што ўсё будзе добра.

***— Апошнія поспехі БАТЭ даюць падставу гаварыць, што Барысаў становіцца футбольнай сталіцай Беларусі?***

— Я лічу, што так і ёсць. Нават не беручы пад увагу Лігу Чэмпіёнаў. Два апошнія нацыянальныя чэмпіянаты мы былі першымі. У гэтым сезоне таксама хацелася б стаць чэмпіёнамі. Хаця аб гэтым пакуль што рана размаўляць — у канкурэнтаў яшчэ ёсць шанцы нас дагнаць.

***— Барысаву не хапае толькі стадыёна, на якім бы БАТЭ праводзіў хатнія матчы Лігі Чэмпіёнаў...***

— Гэта было б ідэальна. Хаця з другога боку няма вялікай неабходнасці, таму што на матчы чэмпіянату Беларусі збіраецца аўдыторыя, значна меншая па колькасці, чым на еўракубкі.



Фота Пятра ФАМІНА.

***— Поспехі БАТЭ зноў уздымаюць старое пытанне аб плюсах і мінусах стварэння ў Беларусі суперклуба. Твой погляд на гэта?***

— Удалае выступленне БАТЭ — вынік росту беларускага чэмпіянату ў цэлым. І канкурэнцыя тут не на апошнім месцы. Калі б у нас быў такі слабы турнір, як некаторыя кажуць ці пішуць, то не было б і гэтых вынікаў у БАТЭ. Мы ж гуляем пэўную колькасць матчаў, у нас ёсць тая самая канкурэнцыя, кожны раз да апошняга застаецца інтрыга. Таму не ўсё так дрэнна. Я згодны, што трэба яшчэ многа працаваць. Развіваць футбольныя школы, стадыёны. Тады і будзем расці далей.

***— А можна за кошт астатніх беларускіх клубаў узмацніць БАТЭ, каб рэгулярна выступаў у еўракубках. Вось як гэта зроблена з мінскім «Дынама» ў Кантынентальнай хакейнай лізе...***

— Такое малаверагодна. Ды і не мае вялікага сэнсу. МТЗ-РІПА і мінскае «Дынама» — клубы з амбіцыямі, таму канкурэнцыя ў нашым чэмпіянаце будзе заўсёды.

***— Зараз многія гадаюць, колькі футбалістаў асноўнага складу застанецца ў БАТЭ пасля заканчэння сезона. Як пракаментуеш такія прагнозы?***

— Для беларускага футбола было б, мабыць, найлепш, каб усе мы засталіся і прадоўжылі выступленні ў нацыянальным чэмпіянаце. Аднак для гэтага трэба ствараць адпаведныя ўмовы.

З другога боку, футбалісты — людзі з амбіцыямі. Людзі, якія жадаюць расці, развівацца. А для гэтага, вядома ж, трэба ехаць выступаць у больш моцны чэмпіянат. Хаця магу паўтарыць, што калі стварыць выдатныя ўмовы, можна будзе прагрэсіраваць і ў нашай краіне.

**Юрась ШАЎЦОЎ.**

## МОВАЙ ВІДЭА АБ ГЛАБАЛЬНЫМ ГОЛАДЗЕ

**Кожныя шэсць секундаў у свеце ад голаду памірае адно дзіця.**

У Сусветнай харчовай праграме вырашылі змагацца з гэтай страшэннай з'явай з дапамогай відэаролікаў і аб'явілі конкурс кароткаметражных фільмаў і сюжэтаў. Яго мэта — павысіць дасведчанасць сусветнай грамадскасці пра наступствы глабальнага харчовага крызісу.

Ідэя конкурсу выклікала вялікую цікаўнасць сярод студэнтаў і будучых кінарэжысёраў. На суд журы былі прадстаўлены дзясяткі відэаролікаў з Бразіліі, Канады, Кітая, Чэхіі, Францыі, Грэцыі, Італіі, Літвы, Польшчы і ЗША.

Член журы Эдвард Звік, рэжысёр фільмаў «Крывавыя алмазы» і «Апошні самурай», адзначыў талент аўтараў шэрагу відэасюжэтаў, якія выйшлі ў фінал. Яны, на яго погляд, здолелі прадаставіць масаваму гледачу простую ідэю гранічна ясна і з вострай перакананасцю.

Лепшыя работы будуць размешчаны ў інтэрнэце.

**Леанід ТУГАРЫН.**

Рэпарцёр атрымаў заданне...

# НАВЕДАЦЬ ЮРЫДЫЧНУЮ КЛІНІКУ,

## дзе можна атрымаць прышчэпку ад прававой «непадкаванасці»

— Людзі, якія ўпершыню чуюць назву «Юрыдычная клініка», звычайна крыху губляюцца, — усміхаецца Любоў Красніцкая, яе загадчыца, бо прызвычаіліся чуць слова «клініка» ў медыцынскай сферы. Проста не ўсе ведаюць, што гэтае слова азначае «атрыманне ведаў на практыцы».

**КРЫХУ ГІСТОРЫІ**

Упершыню тэрмін «юрыдычная клініка» выкарыстаў у 1881 годзе ў адным з часопісаў нямецкі прафесар Фромгольд. Ен зрабіў акцэнт на карысць, якую прыносіць для медыцынскай практыкі існаванне клінік пры медыцынскіх факультэтах і акадэміях. Аўтар прапанаваў па аналогіі стварыць клінікі пры юрыдычных ВНУ, дзе студэнты не разбіралі б пад кіраўніцтвам прафесараў не выдуманыя або аджыўшыя юрыдычныя задачкі, а аказвалі б непасрэдную дапамогу людзям, займаючыся іх рэальнымі прававымі праблемамі.

Першыя юрыдычныя клінікі з'явіліся ў Амерыцы. Хутка яны набылі распаўсюджанне ў Расіі, Польшчы, ва Украіне. А вось на радзіме ідэі, у Германіі, да іх паставіліся не вельмі станоўча.

У нашай жа краіне сёння дзейнічаюць 11 такіх клінік пры юрыдычных факультэтах універсітэтаў. Чатыры з іх працуюць у Мінску.

**АДНЫМ СТРЭЛАМ...**

Навучальная лабараторыя «Юрыдычная клініка» юрфака БДУ з'явілася ў рамках праекта праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь «Юрыдычная клініка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце» ў снежні 2000 года. Праект увасобіўся ў жыццё праз тры гады для таго, каб даць практыку тэарэтычным навыкам працы юрыста, выхаваць важныя ў далейшай кар'еры якасці студэнтам старэйшых курсаў.

— Клініка створаная ў першую чаргу для студэнтаў, — расказвае Любоў Красніцкая. — Гэта навучальная лабараторыя, дзе будучы правазнаўца мае магчымасць прымяніць свае веды на практыцы, папоўніць свой запас новымі ведамі, навучыцца кантактаваць з кліентам. У гэтым заключаецца адукацыйная мэта Юрыдычнай клінікі. Сацыяльная ж мэта — даць маламаёмасным людзям, у якіх няма сродкаў на адваката, бясплатную юрыдычную кансультацыю па хвалюючым іх пытанні.

Прававая дапамога ў клініцы аказваецца па сістэме «другаснага прыёму». Пры першай сустрэчы студэнт атрымлівае ад кліента ўсю неабходную інфармацыю па сітуацыі, якая патрабуе рашэння. Затым самастойна вывучае нарматыўны матэрыял і складае дакументы прававога характару. Пасля гэтага ён кансультуецца з выкладчыкам, які правярае правільнасць вырашэння пытання. Прычым выкладчык толькі паказвае, дзе памылка, калі яна ёсць, але не называе яе, бо яго задача — не пазбавіць самастойнасці, а перасцерагчы студэнта ад магчымых памылак.

Такім чынам, усю працу робіць студэнт. І толькі пасля гэтага прызначае кліенту час другаснага прыёму і дае кансультацыю з улікам заўваг і прапаноў свайго кіраўніка. Такая сістэма дазваляе кантраляваць дзейнасць будучых юрыстаў і забяспечваць аказанне правільнай і кваліфікаванай прававой дапамогі.

— Хачу звярнуць увагу на тое, што мы не даём афіцыйных юрыдычных кансультацый, а з'яўляемся толькі навучальнай лабараторыяй для студэнтаў, — акцэнтуе ўвагу Любоў Мікалаеўна. — Юрклініка не мае паўнамоцтваў выносіць афіцыйныя заключэнні. Усе нашы заключэнні маюць рэкамендацыйны характар. Мы падбіраем для кліента варыянты рашэнняў, расказваем аб плюсах і мінусах кожнага варыянта. Знаходзім неабходныя нормы, кансультуем па заканадаўстве, дапамагаем складаць дакументы юрыдычнага характару, растлумачваем парадак дзеянняў пры абароне інтарэсаў грамадзян у дзяржаўных органах. А калі справа вельмі складаная, раім звярнуцца да прафесійнага юрыста.

**ДЗЕЦІ ФЕМІДЫ**

Сёння ў Юрыдычнай клініцы займаюцца 18 студэнтаў. Трапіць сюды можна толькі ў другім семестры трэцяга курса пасля папярэдняга адбору. Пасля курса заняткаў па рабоце з кліентам можна прыступіць да працы ў якасці кансультантаў. Усё на добраахвотнай і бясплатнай аснове.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**



## Генеральны дырэктар ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 2, г. Гомель» Канстанцін Кастэнка:

# «ДАРОГІ — ГЭТА АРТЭРЫІ ЖЫЦЦЯ, МЫ ІХ СТВАРАЕМ І АДНАЎЛЯЕМ. ЯКАСНА»

### ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ



*Генеральны дырэктар Канстанцін КАСТЭНКА.*

**Яго радзіма — Сібір, дзе прайшлі дзяцінства, юнацтва, школьныя гады. Там жа атрымаў вышэйшую адукацыю пасля заканчэння механічнага факультэта Омскага аўтадарожнага інстытута. Як прызнаецца сёння Канстанцін Канстанцінавіч, дарожным будаўніком ён не збіраўся стаць, бо перавагу аддаваў механізмам і тэхніцы. Толькі лёс распарадзіўся інакш. А было гэта так.**

**Пасля службы ў арміі Кастэнка паступіў у аспірантуру свайго інстытута і як аднаго з маладых перспектыўных спецыялістаў яго запрасілі на працу ў Казахстан на машынавыпрабавальную станцыю дарожных машын, якая толькі стваралася і была на той час адзінай у Савецкім Саюзе, уваходзячы ў Міністэрства аўтамабільных дарог. У гэтай сярэднеазіяцкай рэспубліцы ён адпрацаваў 16 гадоў, узняўшыся на высокія кіраўніцкія пасады з пасады старшага інжынера. Быў ён галоўным інжынерам, затым дырэктарам вышэйназванай станцыі, узначальваў трэст «Дарбудмеханізацыя». Апошнюю пасаду займаў сем гадоў, набыўшы вялікі вопыт. Прыгадваючы тыя часы, Канстанцін Канстанцінавіч гаворыць, што там, у Казахстане, ён сфарміраваўся як спецыяліст. Як вядома, Казахстан — гэта па тэрыторыі тры Францыі, а добрых дарог было там мала. Трэст меў статус рэспубліканскага значэння, а гэта азначала, што ён падпарадкоўваўся кіраўніцтву рэспублікі і міністэрству. У калектыве працавала тры з паловай тысячы чалавек, а дарогі будаваліся ва ўсіх 19 абласцях. Аб маштабах трэста, яго вытворчым фінансавым патэнцыяле сведчыць хоць бы тое, што ён меў нават свае вахтавыя самалёты. Станаўленне і развіццё яго ў многім звязана з мэтанакіраванай дзейнасцю кіраўніка Канстанціна Канстанцінавіча Кастэнкі, якому было прысвоена званне заслужанага будаўніка Казахскай ССР.**

**Такое ж званне ён атрымаў і ў нашай краіне, калі ў 1982 годзе сям'я пераехала на пастаяннае месца жыхарства ў Беларусь, на радзіму жонкі (яна родам з Брэсцкай вобласці). У Мінску яму прапанавалі пасаду галоўнага інжынера Гомельскага дарожна-будаўнічага трэста № 2, папярэдзіўшы, што арганізацыя — адстаючая і галоўная задача яе кіраўніцтва ў тым, каб выправіць становішча спраў. Так што — за работу, быў яму наказ.**

**— Што з гэтага атрымалася, Канстанцін Канстанцінавіч? Вы ў трэсце працуеце ўжо дваццаць сёмы год. Жыццёвы шлях, жыццёвая дарога, адным словам. Вышыня за вышынёй. Да звання заслужанага будаўніка Рэспублікі Беларусь за вашу асабістую працу дабавіўся яшчэ і ордэн «Знак Пашаны». Ці не так?**

— Усё так, усё правільна. Трэст — адзін са старэйшых дарожна-будаўнічых падраздзяленняў рэспублікі. У ім працуе 1300 чалавек, з якіх звыш 400 інжынерна-тэхнічных работнікаў, і ён валодае магутным вытворчым патэнцыялам, працуючы ва ўсіх абласцях рэспублікі, а таксама ў Расіі і ва Украіне. Геаграфія работ нашага акцыянернага таварыства — ад Карскага да Чорнага мораў, Урал, Сібір, Цэнтральная Расія. Сёння значныя сілы трэста задзейнічаны на рэканструкцыі аўтамагістралі «Дон» М4 — алімпійскай дарозе Масква — Сочы.

Летась калектыў выканаў усе даведзеныя прагнозныя паказчыкі, забяспечыў рост усіх аб'ёмных і эканамічных заданняў, паспяхова спраўляецца з імі і сёлета. Нельга не сказаць і пра тое, што ў комплексе ўсіх работ, якія мы выконваем, калектыў кіруецца тымі стандартамі, што шырока прымяняюцца ў сусветнай практыцы: ІСО-9001, ІСО-14001, СТБ-18001. Цяпер мы метадычна аб'ядналі ўсе гэтыя сістэмы стандартаў па якасці, ахове працы і экалогіі ў адзіную сістэму арганізацыі і кантролю, што і дае свой плён.

**— Пералічанае вамі гучыць вельмі ўнушальна. Іншымі словамі, калектыў выйшаў на міжнародны ўзровень. Да нас даходзілі чуткі, што вам прапаноўвалі паўдзельнічаць у тэндары будаўніцтва дарог у Тунісе, Алжыры і Марока, на Афрыканскім кантыненце. Напэўна, не чакалі такога?**

— Спачатку хачу адзначыць, што асноўныя асаблівасці работы нашага трэста ў адрозненне ад іншых трэстаў рэспублікі — гэта экспарт будаўнічых паслуг і вахтавы характар работы ўдалечыні ад стацыянарных вытворчых баз. Сёння, як і раней, загрузкі ў сваёй Гомельскай вобласці нам не хапае. Мы ўключаны ў камп'ютарны рэестр расійскіх падрадчыкаў, і нам прапаноўваюць работу на будаўніцтве дарог там. Вядома ж, каб атрымаць яе, неабходна ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі выйграць тэндар. А сапернічаць нам даводзіцца і з расіянамі, і з немцамі, і харватамі, і туркамі, і фірмамі іншых краін.

Вось я гаварыў аб удзеле ў будаўніцтве дарогі Масква — Сочы, дзе нашы людзі працуюць ужо два месяцы. Гэта 150 чалавек з чатырох упраўленняў, якія на ўчастку ў сорак кіламетраў павінны выканаць цэлы комплекс работ, зрабіць унікальныя пешаходныя пераходы з выкарыстаннем металічных гафрыраваных элементаў, пакласці асфальтабетон. Гэтых работ нам хопіць да 2014 года, а потым будзем рухацца далей.

Карацей кажучы, у Расіі мы шмат дзе былі задзейнічаны, а ва Украіне будавалі аўтамагістраль Кіеў — Адэса і, як кажуць, падтрымалі гонар нацыянальнага сцяга.

**— А што з прапановамі папрацаваць на Афрыканскім кантыненце?**

— Там прадугледжвалася заключэнне кантрактаў не на мільёны, а на мільярды амерыканскіх долараў. Заманліва, але ўсе складанасці ў наступным. Перад тым, як трапіць на тэндар, трэба ўнесці заклад у суме да пяцідзесяці мільёнаў «зялёных». У нас такіх грошай няма. Спрабавалі звярнуцца ў Нацыянальны банк, ды нічога з гэтага не атрымалася. Больш за тое, каб атрымаць аванс, патрабуецца паручыцельства першакласнага еўрапейскага банка, а там нас ніхто не ведае. Адным словам, патрэбна была падтрымка ўрада краіны. А ў яго, вядома, шмат іншых важных і неадкладных задач. Нядаўна нам паступіла прапанова з Украіны паўдзельнічаць у рэканструкцыі аўтабана Кіеў — Масква. Мы адмовіліся з-за таго, што наш партфель заказаў поўны і работы неабходна выконваць у тыя тэрміны, якія былі вызначаны.



*Старшыня аб'яднанай прафсаюзнай арганізацыі трэста Людміла КОПАЦЬ.*

**— Напэўна, Канстанцін Канстанцінавіч, на рахунку калектыву шмат пабудаваных і рэканструяваных дарог у нашай рэспубліцы.**

— Безумоўна, многа. Цяжка нават пералічыць іх усе. Дарогі кальцавая вакол Мінска, Мінск — Маладзечна — Нарач, удзел у будаўніцтве сямі буйных мастоў цераз Сож, Прыпяць, Дняпро, у тым ліку самага вялікага ў Беларусі ў раёне Турава. Не, што ні кажыце, а ўспомніць сапраўды ёсць што.

У гутарку ўступае галоўны інжынер Уладзімір Іванавіч Аксёнаў:

— Хачу дапоўніць Канстанціна Канстанцінавіча. Працаўнікі трэста будавалі і рэканструявалі аўтадарогі Масква — Растоў — Баку, Уфа — Магнітагорск, Масква — Ніжні Ноўгарад і г.д. Наогул былі часы, калі аб'ёмы работ калектыву ў Расійскай Федэрацыі складалі 60 працэнтаў агульных аб'ёмаў.

**— А як усё ж пачыналася работа там? Вы самі прапанавалі свае паслугі ці вас запрасілі туды?**

**Канстанцін Кастэнка:** Усякае было. Нам неаднаразова даводзілася пераадольваць розныя цяжкасці і праблемы. Асобная і, я сказаў бы, гераічная старонка ў жыцці калектыву была звязана з чарнобыльскай катастрофай. Нам была пастаўлена задача як мага хутчэй заасфальтаваць дарогі ў раёнах, дзе аселі радыенукліды, пракласці новыя дарогі, «закатаць» у асфальтабетон пад'езды да жывёлагадоўчых фермаў, машынна-трактарных двароў і г.д.

Не шкадуючы сілаў, аператыўна і з велізарнейшай нагрузкай працавалі нашы людзі. Шкада, што многія з іх ужо пайшлі з жыцця. Уявіце сабе, што за дзень мы выраблялі і ўкладвалі ў дарогі да шасці тысяч тон асфальтабетону. Для параўнання: у звычайным рэжыме такі аб'ём дасягаўся за паўмесяца. У тыя часы на цвёрдае пакрыццё дарог было ўкладзена 1200 тысяч тон асфальтабетону.

Чарнобыльскі ўдар быў вельмі адчувальным для калектыву. Пасля 1986 года мы страцілі каля 60 працэнтаў інжынерна-тэхнічнага персаналу, звольніліся ў выніку перасялення ў іншыя раёны рэспублікі і былой краіны многія рабочыя. А тут яшчэ і распад Савецкага Саюза, калі парушыліся эканамічныя сувязі паміж суб'ектамі гаспадарання і пачынаўся пэўны застой. У выніку многія арганізацыі, у тым ліку і дарожнае будаўніцтва, спынілі сваё існаванне.

Нам жа ўдалося выжыць. У Беларусі, ужо самастойнай краіне, работ для калектыву было мала. У суседняй Расіі дарожная галіна аказалася напалову разбуранай. Вось мы і прапанавалі тады свае паслугі, паказалі, на што здатныя. Так і былі заваяваны ў Расіі аўтарытэт і павага.

**Уладзімір Аксёнаў:** З кожным годам аб'ёмы падрадных работ трэста павялічваюцца. Калі ў 2006 годзе яны склалі больш як на 46 мільярдаў рублёў, дык летась — 68 мільярдаў. Сёлета за студзень — жнівень уласнымі сіламі выканалі іх на 45 мільярдаў і атрымалі прыбытак у 3761 мільён рублёў. Рэнтабельнасць вытворчасці склала 8,49 працэнта. Гэта значна вышэй за аналагічны перыяд мінулага года. Расцём! Сёлета здалі апошні ўчастак аўтадарогі Мінск — Маладзечна — Нарач і два 30-кіламетровыя ўчасткі дарогі ў Брэсцкім напрамку. Вялікі аб'ём работ, ажно на 17 мільярдаў рублёў, выконваем у Мінскім раёне, у тым ліку і па добраўпарадкаванні населеных пунктаў.

**— Канстанцін Канстанцінавіч, як бачна, трэст сёння знаходзіцца на перадавых пазіцыях, і мы толькі прыблізна можам уявіць сабе, колькі намаганняў давялося прыкласці асабіста вам, спецыялістам, усяму калектыву, каб выйсці з прарыву. Давайце вернемся ў тыя часы.**

— Калі я прыбыў у Гомель, мяне доўга не пакідала думка, што ад многага трэба адмаўляцца, многае наладжваць. Дрэнна з дысцыплінай, тэхналогіяй, мала новай тэхнікі, не ўсе кадры адпавядалі патрабаванням дня. Куды гэта варта, напрыклад, што каласальнымі былі штрафы за прастоі вагонаў, якія дастаўлялі нам грузы і матэрыялы? Што рабочыя дапускалі прагулы, а хто-ніхто захапляўся спіртным на рабочых месцах. З непарадкамі давялося змагацца ўсімі сіламі.

**— Напэўна, скаргі тады паляцелі на вас? Маўляў, «новая мятла» вунь што вырабляе. Над людзьмі здзекуецца. Было такое?**

— Было. Ананімкі даймалі. Але паражылі гэта, і праз некалькі месяцаў трэст пачаў атрымліваць прыбыткі і неўзабаве мяне прызначылі яго кіраўніком. Упор быў зроблены на пошук таленавітых людзей у кіраўніцкім апараце і спецыялістах. Была створана каманда аднадумцаў. У тыя часы мы актыўна ўзяліся за будаўніцтва вытворчых баз, бо не было ніводнай такой, якая б задавальняла патрэбнасці ні сярод асфальтабетонных заводаў, ні сярод рамонтна-механічных майстэрняў і г.д. Назіраўся дэфіцыт і з жыллём, не адпавядалі і ўмовы працы людзей. Паступова прывялі ў парадак тыя заводы, купілі новыя, арганізавалі бітумныя базы, зрабілі тупікі разгрузкі, прымяніўшы там метад вібраразгрузкі вагонаў, што шматразова эканоміла час, павышала эфектыўнасць вытворчасці. Мы дасягнулі нават таго, што амаль кожны год пачалі будаваць для сваіх работнікаў па 60-кватэрнаму дому.

**— Усё гэта, напэўна, сведчыць аб тым, што новым тэхналогіям і тэхніцы пачала надавацца першарадная ўвага?**

— Вядома. Мы першымі сярод дарожнікаў Беларусі ўкаранілі вахтавы метад работы, які дзейнічае і цяпер і без якога нам ніяк не абысціся. Найбольш значнае наша дасягненне, лічу, — так званая мембранная тэхналогія, якой няма ні ў адным дарожным трэсце рэспублікі. Растлумачу, што гэта такое. У 60—70-я гады ў Беларусі былі пабудаваны бетонныя дарогі, якія пачалі выходзіць са строю. У іх, скажам так, не працуюць швы паміж плітамі, якія пачалі зрушвацца, з'явіліся ўспучванні. Калі проста перакрыць бетон, з-за розніцы ў каэфіцыентах аб'ёмнага расшырэння бетону і асфальтабетону ўтвараюцца новыя трэшчыны на месцы старых.

Сутнасць жа нашай тэхналогіі ў тым, што спачатку мы рамантуем швы, потым тонкім слоем размяркоўваем мембрану (вобразна кажучы, тым самым ствараем коўдру з пругкай бітумнай масцікі) і затым накладваем тонкі слой каркаснага асфальтабетону, у якім 75 працэнтаў шчэбеню, але не на простым бітуме, а на мадыфікаваным, у які дадаюцца палімерныя матэрыялы. Вось і ўсё. Затрат мала. Хутка і надзейна.

**— Гэта ваша распрацоўка?**

— Беларускага дарожнага навукова-даследчага інстытута, з якім мы цесна супрацоўнічаем, а ўкаранілі гэтую навінку толькі мы. Новым у нашых работах з'яўляецца і тое, што мы шырока выкарыстоўваем адходы металургічнай вытворчасці — шлак. Справа ў тым, што сёння ў нашай краіне вялікі дэфіцыт гранітнага шчэбеню, таму яго і даводзіцца прымяняць. Сёлета выкарыстал і гэтага матэрыялу ўжо каля 20 тысяч тон. У справу пускаем і стары здробнены бетон, які ўжо адслужыў сваё ў ранейшых вырабах. У гэтым напрамку мы супрацоўнічаем з Нацыянальнай акадэміяй навук.

На надгрунтоўках мы даўно ўжо не прымяняем бітум, а замест яго, дарэчы, як і на іншых працэсах, выкарыстоўваем як простыя, так і мадыфікаваныя эмульсіі, што больш надзейна і эфектыўна. Практычна ўсе новыя распрацоўкі, якія мы ўкараняем, — вынік цесных кантактаў з вышэйназванымі навуковымі ўстановамі, Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэтам, Магілёўскім машынабудаўнічым універсітэтам і іншымі арганізацыямі. Пералік тэхнічных і тэхналагічных навінак можна працягваць далей. Мы маем увесь неабходны парк тэхнікі, абсталявання. Дарэчы, частку іх паказвалі вам на рэканструкцыі аўтамагістралі, што паблізу абласнога цэнтра. У нас цяпер практычна ўсе асфальтабетонныя заводы і асфальтаўкладчыкі абсталяваны сістэмамі аўтаматыкі. Апошнія да таго ж аснашчаны спецыяльнымі фрэзамі, што дае магчымасць зразаць стары асфальтабетон на дарогах і паўторна пускаць яго ў справу, а электронная аўтаматыка дазваляе вытрымліваць як папярэчны, так і прадольны профілі, чым дасягаецца роўнасць пакрыцця дарог. Вось і нядаўна мы закупілі два самыя сучасныя шведскія асфальтаўкладчыкі, якія будуць перададзены ў ДБУ-10 (Калінкавічы) і ДБУ-21 (Жыткавічы). Наогул, мы планамерна абнаўляем тэхніку згодна са спецыяльна распрацаванай праграмай.









*Галоўны інжынер трэста Уладзімір АКСЁНАЎ (справа) завітаў да калегі дарожна-будаўнічага ўпраўлення № 17 Сяргея ДЗЮКА.*

*Будуецца ўнікальны пераход праз чыгунку з гафрыраваных металаканструкцый на адным з участкаў дарогі Масква — Мінск — Варшава.*

*Ідуць будаўніча-ўкладачныя работы на ўчастку дарогі Гомель — Хутар. Студэнты-практыканты дарожна-будаўнічага тэхнікума Сяргей КУЛІБА і Яўген КОМАР.*

**— Мы ведаем, Канстанцін Канстанцінавіч, што на базе вашага ДБУ-17 нядаўна прайшоў рэспубліканскі семінар на тэму «Ахова працы, культура вытворчасці і добраўпарадкаванне тэрыторый», які праводзіла Міністэрства транспарту і камунікацый рэспублікі.**

— У ім удзельнічалі 250 дэлегатаў ад прадпрыемстваў аўтамабільнай і дарожнай гаспадарак, авіяцыі, чыгункі. Дык вось было адзначана, што ў ДБУ-17 створаны калі не ідэальныя, дык выдатныя ўмовы для работы людзей. І яно заняло першае месца.

**— Мы наведаліся туды і ўсё бачылі на свае вочы, гутарылі з загадчыцай фізкультурна-аздараўленчага комплексу Аленай Васільеўнай Лучковай, якая выступала ў ролі і гаспадыні ўстановы, і гіда. Там для работнікаў трэста і плавальны басейн, і саўна, і залы трэнажорныя, спартыўныя, пакоі псіхалагічнай разгрузкі, і многае іншае. Працуе медпункт з працэдурным кабінетам, робяцца ручныя і падводныя масажы і г.д.**

— Гэта ж яшчэ не ўсё. У нас на беразе старога рэчышча Сожа ў маляўнічым месцы маецца спартыўна-аздараўленчая база «Сцюдзёная Гута». Дадам да гэтага і наступнае. Нашы людзі ў асноўным працуюць вахтавым метадам па 12—14 гадзін на працягу паўмесяца. За сотні кіламетраў ад дома. Туды яны дастаўляюцца камфартабельнымі аўтобусамі. Жывуць у вахтавых гарадках, дзе ёсць спальныя вагончыкі, сталовая, душавая, сушылкі, прыбіральні (біяпрыбіральні), вагон-лабараторыя, вагон-майстэрня, пляцоўкі для адпачынку і да т.п. Усё гэта зроблена сіламі нашага ўпраўлення вытворча-тэхналагічнай камплектацыі. У штаты сталовых набіраюцца лепшыя кухары, і скаргаў на харчаванне ў людзей не ўзнікае. Нельга не сказаць і пра тое, што кошт пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку для працаўнікоў трэста складае 20 працэнтаў ад агульнага іх кошту, што дзеці нашых работнікаў адпачываюць і папраўляюць здароўе ў Крыме наогул бясплатна.

**— А што са стварэннем бяспечных умоў працы?**

— І тут у нас парадак. Сёлета ў ліпені Дзяржкамітэт па стандартызацыі выдаў нам сертыфікат адпаведнасці патрабаванням СТБ 18001—2005 (OHSAS18001:1999). Гэта азначае, што сістэма кіравання аховай працы адпавядае міжнародным стандартам.

**— Канстанцін Канстанцінавіч, набліжаецца прафесійнае свята — Дзень аўтамабіліста і дарожніка. Што б вы хацелі пажадаць свайму калектыву?**

**— Выказваю ўсім нашым работнікам глыбокую ўдзячнасць за добрасумленную працу, адданасць справе. Віншую ўсіх са святам. Жадаю поспехаў у працы, сямейнага шчасця і дабрабыту. Добрага настрою. І, вядома, сібірскага здароўя!**

**Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Уладзімір ПЕРНІКАЎ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.**

**НАШ АДРАС:**
ААТ «Дарожна-будаўнічы трэст № 2, г. Гомель».
246017, г. Гомель, вуліца Чырвонаармейская, 28.
УНН 400022426



*База адпачынку «Сцюдзёная Гута» месціцца побач з маляўнічым Сожам.*





*Загадчыца фізкультурна-аздараўленчага комплексу ДБУ-17 Алена ЛУЧКОВА з гонарам дэманструе сучасныя трэнажоры.*



*Каманда-пераможца з узнагародамі.*



*Начальнік праектна-каштарыснага аддзела Ірына СЕЛІВАНАВА, інжынер-рахункавод Галіна КУРАЧЭНКА і вядучы спецыяліст-праекціроўшчык Еўдакія ПРЫШЧЭПАВА.*

